*Новікаў С. Я. (г. Мінск, МДЛУ)*

# БЕЛАРУСЬ У ПАЧАТКОВЫХ ПАЛІТЫЧНЫХ І ВАЕННА-ЭКАНАМІЧНЫХ РАЗЛІКАХ "ТРЭЦЯГА РЭЙХА"

Высвятленне важнейшых аспектаў нацысцкай ваенна-эканамічнай палітыкі, якая з першых дзён германскай акупацыі праводзілася на захопленай тэрыторыі Беларусі, патрабуе больш паглыбленага пошуку вытокаў палітычных, ваенных і эканамічных дачыненняў вышэйшага кіраўніцтва "Трэцяга рэйха" да г. зв. усходніх тэрыторый.

Германская палітыка ў адносінах да будучай "жыццёвай прасторы" на Ўсходзе знайшла сваё замацаванне ў шэрагу дакументаў, падрыхтаваных да пачатку агрэсіі супраць СССР. У ходзе распрацоўкі дырэктыўных указанняў і распараджэнняў кіраўніцтва "Трэцяга рэйха" разглядала патэнцыял савецкай эканомікі, у тым ліку Беларусі, у якасці аднаго з галоўных аб'ектаў будучай усходняй ваенна-эканамічнай палітыкі. З канца лютага 1941 г. яе распрацоўкай займалася спецыяльна створаная эканамічная арганізацыя "Ольдэнбург" ("Oldenburg"), з чэрвеня 1941 г. – "Усход" ("Ost") [1].

Пры планаванні ваеннай аперацыі супраць СССР нацысцкае ваенна-палітычнае кіраўніцтва зыходзіла з прынцыповых указанняў Гітлера аб усходняй палітыцы рэйха на тэрыторыі "лебенсраўма для Германіі", а таксама аб практычных метадах ажыццяўлення ваенна-эканамічнай палітыкі. Найбольш адметна характар апошняй выяўляе дакументальны запіс, зроблены ў час нарады членаў эканамічнага штаба "Ольдэнбург" 2 мая 1941 г., калі ўдзельнікамі пасяджэння была вызначана не толькі галоўная ваенна-эканамічная мэта ваеннай кампаніі на ўсходзе – харчовае забеспячэнне ўсяго вермахта з Расіі [2, 84] [г. зн. з занятай савецкай тэрыторыі. – С. Н.], але і згаданы злачынныя метады яе дасягнення. Удзельнікі нарады [статс-сакратары германскага ўрада. – С. Н.] былі адзінымі ў думцы, што пры атрыманні ўсяго неабходнага з СССР гэта "без усялякага сумнення прывядзе да *голаду* [выдзелена мной. – С. Н.] дзесяткаў мільёнаў чалавек" [3].

Канкрэтныя задачы па выкарыстанні эканамічных рэсурсаў з тэрыторыі Беларусі вызначаліся "агульнымі палітыка-эканамічнымі дырэктывамі для эканамічнай арганізацыі "Усход" [4, 65-66] ад 23 мая 1941 г. Паводле дакумента, распрацоўшчыкі [дзяржаўны сакратар Г. Бакэ і Г. Томас – начальнік упраўлення па ваеннай эканоміцы і ўзбраеннях. – С. Н.] планавалі атрымаць з беларускай зямлі, бачачы яе ў складзе "лясной зоны", значныя лясныя запасы [5, 65]. Пры гэтым меўся намер аддзяліць тэрыторыю Беларусі ад чарназёмнай зоны СССР. Магчымы недахоп прадуктаў харчавання ў гэтай лясной паласе не азначаў іх абавязковую пастаўку з чарназёмных раёнаў, дзе меліся лішкі прадуктаў, альбо з самой Германіі. Аднак распрацоўшчыкі дырэктыў на той час бачылі харчовае забеспячэнне вермахта ў якасці цэнтральнай мэты.

Нават з прыведзеных матэрыялаў становіцца відавочным, што прынцыповай асновай для распрацоўкі будучай "праграмы" [6, 147] забеспячэння вайсковых часцей з рэсурсаў занятай краіны павінен стаць метад не "павышэння ўраджайнасці, а зніжэння самаўжывання" мясцовым насельніцтвам [7, 65]. Прычым менавіта ў гэтым укладальнікі дырэктыў бачылі найбольш хуткі шлях для атрымання лішкаў харчавання і фуражу, неабходных Германіі ў час правядзення ваеннай аперацыі "Барбароса", асуджаючы тым самым на галодную смерць мільёны савецкіх людзей.

Але гэта быў не адзіны матэрыял, які дае магчымасць для высвятлення злачыннага характару і брутальнай сутнасці германскай ваенна-эканамічнай палітыкі, што знайшла адлюстраванне ў афіцыйных дакуменах нацысцкага кіраўніцтва на этапе падрыхтоўкі захопніцкай аперацыі супраць СССР.

Злачынныя метады, замацаваныя ў ваенна-палітычных дырэктывах ад 23 мая 1941 г., праз тыдзень знайшлі свой працяг у чарговым дакуменце, на гэты раз адрасаваным служачым будучай ваенна-эканамічнай арганізацыі, непасрэдным выканаўцам ўжо распрацаванай злачыннай праграмы – "сельскагаспадарчым фюрэрам" [упраўляючым. – С. Н.]. Пад

кіраўніцтвам члена эканамічнага штаба "Ольдэнбург", рэйхсміністра па харчаванні і сельскай гаспадарцы Г. Бакэ была падрыхтавана спецыяльная інструкцыя, вядомая ў айчыннай гістарыяграфіі пад назвай "12 запаведзей паводзін немцаў на ўсходзе і іх абыходжання з рускімі" [8, 326-328]. Як ні дзіўна, але менавіта для будучых сельгасупраўляючых вызначаецца выключна брутальны характар дзеянняў з мэтай гарантаванага выканання задач па асваенні ўсходніх зямель і атрыманні лішкаў харчавання з беларускай тэрыторыі.

Аднак цэнтральным праграмным дакументам, які напярэдадні аперацыі "Барбароса" вызначаў галоўныя мэты і важнейшыя ваенна-эканамічныя задачы нацысцкай Германіі па заваёве "жыццёвай прасторы" на Ўсходзе, з'явіліся "Дырэктывы па вядзенні гаспа-даркі на нова-занятых усходніх тэрыторыях", вядомыя у айчыннай гістарыяграфіі як "Зялёная папка" Г. Герынга [9], а з нядаўняга часу, дзякуючы расійскаму гісторыку М. І. Семірагу, – і як "Зялёная папка" для Савецкага Саюза [10, 373]. Прынятыя 16 чэрвеня 1941 г., г. зн. за тыдзень да нападу Германіі на Савецкі Саюз, дырэктывы прызначаліся для арыентацыі аператыўнага ваеннага кіраўніцтва ўсіх узроўняў і павінны былі ўступіць у сілу ў раёнах, якія ў хуткім часу будуць знаходзіцца ў падпарадкаванні як ваеннай, так і грамадзянскай адміністрацый.

У дакуменце паказана значэнне эканамічнага патэнцыялу Беларусі: з гэтай тэрыторыі гаспадарчыя службы вермахта павінны атрымаць запасы буйной рагатай жывёлы, ячменю, коней, леса і інш. [11, 19]. Апрача таго, для правядзення пастаўленых эканамічных задач і забеспячэння вайсковых часцей з рэсурсаў краіны германскім гаспадарчым органам трэба выкарыстоўваць рабочую сілу, ваеннапалонных і прыцягваць да працы мясцовае насельніцтва [12, 16].

Зазначым, што дырэктыўныя ўказанні, выкладзеныя ў "Зялёнай папцы" германскім кіраўніцтвам па вядзенні гаспадаркі на акупіраванай усходняй тэрыторыі, захаваліся ў якасці рабочых указанняў практычна да краху ўсёй усходняй кампаніі Гітлера. Сёння гісторыкам вядомы некалькі рэдакцый гэтага дырэктыўнага дакумента, шматкрат дапоўненага і значна пашыранага ў выніку такой увагі з боку вышэйшага ваенна-эканамічнага кіраўніцтва нацысцкай Германіі. Першыя змяненнні ў дакуменце з'явіліся праз месяц пасля яго выдання. З правалам "бліцкрыга" берлінскія стратэгі былі вымушаны тэрмінова ўносіць неабходныя карэктывы ў сваю ўсходнюю палітыку, у тым ліку і ў практыку "вядзення гаспадаркі": асновай работы германскіх гаспадарчых органоў і службаў павінны былі стаць "агульныя прынцыпы эканамічнай палітыкі на новазанятых усходніх тэрыторыях" [13, лл. 42-51], прынятыя ў першай дэкадзе лістапада 1941 г. на нарадзе вышэйшага ваенна-эканамічнага кіраўніцтва з удзелам Герынга. Галоўным законам вядзення вайны з гэтага моманту нацысцкае кіраўніцтва аб'явіла "патрэбнасці ваеннай эканомікі" [14]. Асаблівы акцэнт пры гэтым надаваўся "каланіяльным метадам" эксплуатацыі захопленых рэсурсаў сельскай гаспадаркі, прамысловасці, але першнаперш – мясцовай рабочай сілы, ваеннапалонных.

Сярод іншых праграмных дакументаў, маючых прынцыповае значэнне для ажыццяўлення германскай эканамічнай палітыкі на акупаванай тэрыторыі Беларусі, асабліва той яе часткі, якая патрапіла ў сферу дзейнасці г. зв. грамадзянскай адміністрацыі, асобнае месца займае "Карычневая папка" ці дырэктывы па вядзенні гаспадаркі на новазанятых усходніх тэрыторыях [15], да апошняга часу практычна не вядомыя айчыннаму чытачу ў поўным аб'ёме. Падрыхтаваны восенню 1941 г., аднак апублікаваны за подпісам рэйхміністра А. Розенберга толькі ў красавіку 1942 г., дакумент разглядаўся ў якасці дапаўненняў да часткі І "Зялёнай папкі" [16, 27-28] і датычыўся перш за ўсё органаў грамадзянскага кіравання на тэрыторыі рэйхскамісарыятаў "Остланд" і "Украіна", у лік якіх з канца лета - пачатку восені 1941 г. ўваходзіла больш за палову ўсёй акупаванай тэрыторыі Беларусі. Адсюль планавалася пастаянна атрымліваць такія віды сельгаспрадукцыі, як бульбу, жыта, лён, канаплю, шэрсць, а таксама лесаматэрыялы і інш. [17; 167, 173-174]. Да таго ж у сферу дзейнасці грамадзянскай

адміністрацыі ўваходзілі пытанні агульнага вядзення гаспадаркі, у тым ліку: планаванння і аднаўлення вытворчасці, перапрацоўкі сельскагаспадарчай сыравіны, паставак прадукцыі для вермахта, выкарыстанне мясцовай рабочай сілы, наладжванне гандлю і г. д.

Такім чынам, ужо ў ходзе падрыхтоўкі і на пачатковым этапе правядзення ваеннай аперацыі супраць СССР вышэйшым кіраўніцтвам нацысцкай Германіі былі распрацаваны дырэктыўныя дакументы, спалучаўшыя ў сабе, з аднаго боку, ваенна-стратэгічныя і ваенна-эканамічныя разлікі, а з другога – нацысцкія метады расавай тэорыі і злачыннай ідэалогіі вайны на вынішчэнне мірнага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. Практычна да яе вызвалення летам 1944 г. эканамічны і людскі патэнцыялы нашай краіны з'яўляліся галоўнымі аб'ектамі для цэлага шэрагу гаспадарчых служб, каманд і аддзелаў германскіх акупацыйных органаў улады, іх палітыкі эксплуатацыі, рабавання і вынішчэння.

Падагульняючы сказанае вышэй, неабходна задацца пытаннем: у якой ступені такі падыход можа прывесці да ўдакладненняў папярэдніх навуковых уяўленняў аб характары нацысцкай ваенна-эканамічнай палітыкі, і якія магчымасці такі пошук адкрывае для пашырэння і паглыблення фронта навуковых даследаванняў з улікам распрацовак замежных гісторыкаў па згаданай праблематыцы? Такая пастаноўка пытання патрабуе, на наш погляд, працягу навуковай працы, пошукаў новых дакументаў і выяўлення дадатковых фактаў для таго, каб напісаць рэальную карціну адной з самых трагічных падзей гісторыі беларускага народа ў XX стагоддзі.


1. Bundesarchiv-Militaerarchiv (Федэральны ваенны архіў Германіі, далей – BA-MA), RW 31/80: OKW/ Wi Rue Amt, Stab Ia 1755/41. Namensbezeichnung in der Wi-Organisation Ost (Anlage 4); Archiv des Instituts fuer Zeitgeschichte (Інстытут сучаснай гісторыі ў Мюнхене, далей — A IfZ), ED 2/I, Bd. I. Kriegswirtschaft im Operstionsgebiet des Ostens in den Jahren 1941–1943, Bl. 14; Thomas G. Geschichte der deutschen Wehr- und Ruestungswirtschaft (1918–1943/45). Boppard a. Rh. 1966, S. 271; Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten 1941—1943/ hrsg. von Rolf-Dieter Mueller. Boppard a. Rh., 1991. S. 42.

2. Aktennotiz ueber Ergebnis der heutigen Besprechung mit den Staatssekretaeren ueber Barbarossa, in: Der Prozess gegen die Hauptkriegsverbrecher vor dem Internationalen Mielitaergerichtshof. Nuernberg 14. November 1945–1. Oktober 1946 (далей – IMT). Dok. 2718-PS. Nuernberg 1948, Bd. XXXI.

3. Aktennotiz ueber eine Besprechung der Staatssekretaere vom 2.5.1941, in: Der deutsche Ueberfall auf die Sowjetunion. "Unternehmen "Barbarossa" 1941. Frankfurt a.M. 1999. S. 323; Мировые войны XX века: В 4 кн. Кн. 4: Вторая мировая война: Док. и материалы / Отв. ред. М. Ю. Мягков. М., 2002. С. 133.

4. Wirtschaftspolitische Richtlinien fuer die Wirtschaftsorganisation Ost vom 23.5.41, erarbeitet von der Gruppe Landwirtschaft, in: Verbrechen der Wehrmacht. Dimensionen des Vernichtungskriges 1941-1944. Ausstellungskatalog. Hamburg 2002.

5. Ibidem.

6. Mueller R.-D. Von der Wirtschaftsallianz zum kolonialen Ausbeutungskrieg, in: Das Deusche Reich und der Zweite Weltkrieg. Bd. 4. Der Anfgriff auf die Sowjetunion. Stuttgart 1987.

7. Wirtschaftspolitische Richtlinien fuer die Wirtschaftsorganisation Ost vom 23.5.41, erarbeitet von der Gruppe Landwirtschaft, in: Verbrechen der Wehrmacht. Hamburg, 2002.

8. 12 Gebote fuer das Verhalten der Deutschen im Osten und die Behandlung der Russen vom 1.6.1941, in: Der deutsche Ueberfall auf die Sowjetunion. Frankfurt a.M., 1999.

9. BA-MA. RW 31/128: Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft in der neubesetzten Ostgebieten (Gruene Mappe). Teil I: Aufgaben und Organisation der Wirtschaft. Juni 1941 (1. Auflage). "Зелёная папка" Геринга // Военно-исторический журнал. 1991. № 4. 5; Сравни: Леонтьев А. "Зелёная папка Геринга". ОГИЗ-Госполитиздат, 1942.

10. Семиряга М. И. Коллаборационизм. Природа, типология и проявление в годы второй

мировой войны. – М., 2000.
11. BA-MA. RW 31/128: Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft in der neubesetzten Ostgebieten (Gruene Mappe).
12. Ibidem.
13. Расійскі дзяржаўны ваенны архіў (далей – РДВА), К (гісторыка-дакументальная калекцыя). Ф. 1358 К, оп. 4, д. 1: BfdVP, Wi Fue Stab Ost, V.P.19206/6 g v. 20.11.41 (Abschrift).
14. Там жа. Л. 42; BA-MA. RW 31/85: RM d GR. Beaftragter fuer den Vierjahresplan. Wirtschaftsfuehrungsstab Ost, V.P. 19203/6 g., Bl. 74. Сравни: Преступные цели – преступные средства. Документы об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941—1944 гг.). -М., 1985. С. 62.
15. BA-MA. RW 31/134: Der Reichsminister fuer die besetzten Ostgebiete, III Wi. 2461/42. Die Zivilverwaltung in den besetzten Ostgebieten (Braune Mappe). Teil A: Richtlinien fuer die Wirtschaftsfuehrung. Berlin, April 1942; Новікаў С. Я. Эканамічная палітыка нацысцкай палітыкі Германії ў Беларусі 1941-1944 гг. (агляд крыніц і германскай гістарыяграфаіі 1990-х гадоў). Мн., 2002. С. 160-179. Сравни: Директивы по руководству экономикой во вновь оккупированных областях (Зелёная папка). Ч. 2. Дополнительный материал к части 1 // Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками. Сб. материалов в 3-х т. Т. 2. - М., 1966. С. 181-201.
16. Studien des Instituts fuer Besatzungsfragen in Tuebingen zu der deutschen Besetzungen im 2. Weltkrieg, Nr. 17. Tuebingen 1959.
17. Новікаў С. Я. Эканамічная палітыка нацысцкай палітыкі Германії ў Беларусі 1941-1944 гг. - Мн., 2002.

*Потыльчак А. В. (г. Киев, НПУ им. М. П. Драгоманова)*

## К ВОПРОСУ О ЧИСЛЕННОСТИ ИНОСТРАННЫХ ВОЕННОПЛЕННЫХ И ИНТЕРНИРОВАННЫХ ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ, УМЕРШИХ И ЗАХОРОНЕННЫХ В УКРАИНЕ

Одним из ключевых аспектов в контексте исследования темы немецких военнопленных второй мировой войны в СССР остается вопрос о количестве умерших и захороненных на территории Украины в 1943-1953 гг. узников советских лагерей и рабочих батальонов для военнопленных. Отметим, что в изученной нами источниковой базе в этом вопросе нет требуемой чёткости. По данным, отобранным украинским исследователем В. Левыкиным из документа «Сведения (списки) о количестве кладбищ и захоронений на них умерших военнопленных и интернированных по республикам, краям и областям. 1950 год», который хранится в фондах Российского государственного военного архива, на территории 19 областей Украинской ССР было зафиксировано 293 отдельные могилы и кладбища, на которых находилось 40 293 захоронения. Причем 115 из перечисленных в списке кладбищ на момент составления документа уже считались ликвидированными. Большая часть кладбищ военнопленных и интернированных находилась на территории промышленного юга и востока Украины – в Днепропетровской области (15 – 1 925 могил), Запорожской (15 – 6 707 могил), Харьковской (39 – 3 881 могила), Сталинской (56 – 5 756 могил), Ворошиловградской области (69 – 8 647 захоронений). На долю остальных 14 центральных, южных и западных областей республики приходилось 101 место захоронения военнопленных и интернированных (13 377 могил) [1; 77-99]. Проведенное нами сравнительное исследование вышеприведенных данных и документов из фондов Государственного архива Министерства внутренних дел Украины засвидетельствовало очевидный факт неполноты первых и позволило поставить их репрезентативность под сомнение. Так, в обработанном В. Левыкиным документе почти полностью отсутствуют сведе-